ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
25 ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 7 (1345)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## "Беларускі універсітэт" тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### УНІВЕРСІТЭТ

этыкі і эстэтыкі, які аб'ядноўвае 4 клубы па інтарэсах, пачаў працаваць на мехмаце. Змястоўныя лекцыі прапануюць сваім наведвальнікам клубы «Палітыка і моладзь» і «Ты+я=сям'я». З цікавымі людзьмі дапаможа сустрэцца «Клуб цікавых сустрэч». А клуб «Пагоня» аб'ядноўвае ўсіх аматараў гісторыі, архітэктуры і культуры Беларусі.

Л. МАЛАШЭНЯ.

### ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ

з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прысвечаныя Дню Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, прайшлі на фізфаку. Перад студэнтамі выступілі І. В. Марчанка, Ул. А. Янкавенка, П. К. Якубоўскі, І. Ц. Пракапенка і іншыя выкладчыкі БДУ.

М. ЛАРЫНА.

### ЛАЎРЭАТ

прэміі Ленінскага камсамола рэжысёр Р. З. Ясінскі і аператар А. І. Алай былі нядаўна гасцямі студэнтаў факультэта журналістыкі. Яны падзяліліся з маладымі гледачамі творчымі планамі і задумамі, расказвалі пра герояў сваіх фільмаў — рабочых, калгаснікаў, вучоных, касманаўтаў, будаўнікоў БАМа. У заключэнне сустрэчы выступіла Е. Л. Бондарава, вядомы кінакрытык, доктар філалагічных навук, прафесар.

Г. ГРЭЛЬ,
студэнтка журфака.

### У ЧАРГОВЫ РАЗ

запрашае прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў, аспірантаў, супрацоўнікаў БДУ абанемент навуковай і мастацкай літаратуры універсітэцкай бібліятэкі на адкрыты прагляд кніг па тэме «Фізіка ў сучасным свеце».

З. ШАЛУПЕНКА,
галоўны бібліятэкар.

### НА ПАРАДКУ ДНЯ

пленума камітэта камсамола БДУ, які адбыўся нядаўна, сталі пытанні аб рабоце камітэта камсамола універсітэта па дастойнай сустрэчы XXVII з'езда ЛКСМБ і XIX з'езда ВЛКСМ, аб прадстаўленні навуковых работ маладых супрацоўнікаў на атрыманне прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і іншыя арганізацыйныя пытанні. Выступілі намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце А. Нежавец, сакратар камітэта камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі І. Андрушкевіч, старшыня штаба працоўных спраў А. Чулкоў і іншыя.

А. ЛУКАШЭВІЧ.

# Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!

## У КЛАСЕ ЭВНС

БДУ ЗАЙМАЕ АДНО З ВЯДУЧЫХ МЕСЦ СЯРОД ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ КРАІНЫ ПА ВЫКАРЫСТАННЮ ЭЛЕКТРОННА-ВЫЛІЧАЛЬНЫХ СІСТЭМ У НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ. КЛАС ЭЛЕКТРОННА-ВЫЛІЧАЛЬНЫХ СІСТЭМ (ЭВНС) ПРАЦУЕ НА БАЗЕ УНІВЕРСІТЭЦКАГА ВЫЛІЧАЛЬНАГА ЦЭНТРА. ЭЛЕКТРОННЫ НАСТАЎНІК ДАПАМАГАЕ СТУДЭНТАМ ФІЗФАКА, МЕХМАТА, ХІМФАКА, ФАКУЛЬТЭТА ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ ХУТКА І ДАКЛАДНА РАШАЦЬ САМЫЯ СКЛАДАНЫЯ ЗАДАЧЫ. ПАПЯРЭДНЕ СТУДЭНТЫ ПРАХОДЗЯЦЬ ТЭАРЭТЫЧНЫ КУРС, ЗНАЁМЯЦЦА З ВЫЛІЧАЛЬНАЙ ТЭХНІКАЙ, ПРАВІЛАМІ ЭКСПЛУАТАЦЫІ.

НА ЗДЫМКАХ: 1. ІРА КОРАБАВА—ЛАБАРАНТКА. У КАРОТКІ ТЭРМІН ЯНА АСВОІЛА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ АПЕРАТАРА ЭВМ, ЦЯПЕР АБСЛУГОЎВАЕ КЛАС ЭВНС. 2. СЁННЯ Ў КЛАСЕ ПРАЦУЮЦЬ ДРУГАКУРСНІКІ ХІМФАКА.

Фота В. Шачака.





## МЫ — ЗА МІР

МІР — гэта жыццё, шчасце. Як добра разумеем гэта мы, савецкія людзі! Усюды і заўсёды кожны з нас будзе змагацца за мір, за яго ўмацаванне.

І як важна данесці думку аб неабходнасці міру да сэрцаў людзей іншых краін.

Выкладчыкі падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян з гонарам выконваюць гэтую важную місію. Вельмі многа часу на факультэце ўдзяляецца прапагандзе міру і дружбы паміж народамі, міралюбівай знешняй палітыкі СССР. І гэта асабліва важна зараз, калі разрадка міжнароднай напружанасці з-за мілітарысцкай палітыкі пэўных колаў ЗША знаходзіцца пад пагрозай.

Нядаўна на факультэце прайшоў адкрыты ўрок рускай мовы на тэму «Мы — за мір». У ім прынялі ўдзел усе замежныя студэнты факультэта.

Цудоўныя словы ў абарону міру прагучалі на гэтым уроку. Хвалююча, горача гаварылі студэнты. І няхай яшчэ не ўсё добра са склонамі і дзеясловамі, затое думкі аб неабходнасці міру дайшлі да розумаў і сэрцаў маладых людзей, якія прыехалі на вучобу ў Савецкі Саюз.

І калі ў зале загучаў «Гімн дэмакратычнай моладзі свету», міжволі ўскінуліся ўверх сціснутыя рукі маладых хлопцаў і дзяўчат: нам патрэбен мір!

Пасля мы спыталі ў студэнтаў, што думаюць яны аб барацьбе за мір, якія ўражанні ў іх засталіся ад урока.

**УРАНІЯ СІМОНІ, студэнтка з Кіпра, член кампартыі Кіпра:**

— Калі гаварылі аб вайне, у мяне на вачах паявіліся слёзы, бо народ нашага вострава сам перажыў вайну. Мы ведаем, што гэта страшна і хочам толькі міру. Таму мы, студэнты-кіпрыёты, горача падтрымалі ідэю ўрока і самі прынялі ў ім актыўны ўдзел.

**БАДР ЕЛЬ-ДЗІН АСМАН, студэнт з Судана:**

— Мы разумеем, што мір вельмі патрэбен народам. І хочам, каб ні ў нас у Афрыцы, ні на якім іншым кантыненце не было вайны.

А. ЛЫСЦОЎ,
выкладчык кафедры
рускай мовы
падрыхтоўчага
факультэта.



Тысячы мінчан і гасцей сталіцы наведалі павільён на ВДНГ БССР. У шматлікіх экспанатах адлюстраваны 60-гадовы шлях нашага універсітэта.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Супрацоўнікі НДІ ПФП рыхтуюць галагенную прыладу. 2. У час падрыхтоўкі выстаўкі.

Фота В. ШАЧАКА.



● ЛЕПШАЯ СТУДЭНЦКАЯ ГРУПА

# «У НАС—КАЛЕКТЫЎ»

Пра сваю групу Сяргей Саладоўнікаў сказаў:

— У нас — калектыў.

Удумайцеся: не проста група, а значна больш — калектыў. Ці кожны з вас вось так упэўнена і адразу можа адказаць, што жыве ў дружным, з'яднаным калектыве?

Са студэнтамі IV курса аддзялення палітэканоміі гістфака я правяла некалькі дзён і не адзін раз пераконвалася ў справядлівасці слоў камсорга. Гутарка пра калектыў зайшла ў нас у самы першы дзень нашага знаёмства, і цяпер мяне цікавіла, як іх група стала лепшай сярод акадэмічных груп ВНУ рэспублікі, пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач»?

...Ішла звычайная на іх факультэце лекцыя — планаванне народнай гаспадаркі. Шчыльна засяліўшы першыя рады, яны не проста ўважліва слухалі выкладчыка, не проста спяшаліся запісаць пачутае, яны здзіўляліся.

Яны тут жа імкнуліся разабрацца ў матэрыяле, успрыняць атрымліваемую інфармацыю.

Удумлівая, сур'ёзная аўдыторыя слухала выкладчыка. Ён гэта адчуваў, расказваў жыва, цікава. А калі на перапынку я хацела даведацца пра іх любімыя лекцыі, яны, не разумеючы, пaглядзелі адзін на аднаго, адказалі:

— Цяжкае пытанне. Усё вырашаюць семінары.

У іх групе, якая складаецца з дваццаці чатырох чалавек, у сярэднім дзесяць студэнтаў штогод здаюць экзамены толькі на выдатна.

— Гэта не вельмі і многа,— сказала мне стараста першай падгрупы Наташа Грэк.—Бывае і па пятнаццаць выдатнікаў.

Стопрацэнтная паспяховасць, вучоба наогул без троек—згадзіцеся, такое не часта сустракаецца ў студэнцкіх групах. А тут — звычайная з'ява, проста агульны настрой.

— Таму і імкнешся падцягнуцца, калі адчуваеш нейкую слабінку, — сказаў хтосьці з іх.

— Якая галоўная рыса вашага калектыву? (Гавораць жа так пра чалавека: яго інтарэсы, яго ўнутраны свет, яго характар).

Косця Бялугін задумаўся:

— Сур'ёзныя адносіны да любой справы. І не толькі да вучобы.

Шмат чаго я даведалася пра іх актыўную грамадскую работу (як на курсе, так і ў маштабах універсітэта), пра іх нязменны ўдзел у студэнцкіх будаўнічых атрадах («Калі студэнт не пабываў у СБА, ён яшчэ не студэнт»,—сказаў заўзяты будатрадавец групы Віктар Кляцкоў), пра іх значную навуковую работу. Але больш мяне цікавіла ўнутранае жыццё групы, яе псіхалагічны клімат. Калі працягваць размову пра калектыў, то які агульны дух задаваў вышыню іх рабоце на працягу некалькіх год?

...На самай першай «бульбе», у саўгасе «Навінка» Талачынскага раёна, тыдні два яны гулялі ў «ручаёк», пакуль усе не перазнаёміліся. А калі пазнаёміліся, то зразумелі, што аснова будучага калектыву — агульнасць інтарэсаў — у іх ёсць.

— Ну, гэтак нецікава,—расчаравалася я. — Сышліся характарамі, вось і ўсё.

Яны ўсміхнуліся:

— Ну што вы, мы такія розныя...

Я назірала. Гумарыст Саладоўнікаў, які «экспромтам можа выдаць што хочаш», ініцыятыўная і рухавая Наташа Грэк, сур'ёзны, гатовы адказаць на любое пытанне Георгій Васільевіч, разважлівая Таня Радчанкава, стараста курса Міша Кадыка — «справядлівы, але спуску не дае». Самае галоўнае: іх надзейна аб'яднала адна і тая ж накіраванасць, жаданне працаваць і вучыцца па-сапраўднаму.

— Значыць, адзінства процілегласцей?

— Ну, навошта так спрошчваць?

— Разумееце,— сказала Таня Радчанкава ў канцы размовы,—у нас ніколі не бывае расколаў. У нас усё разам, заўсёды. Канешне, маленькія групкі ў любым калектыве непазбежны. Але ў нас яны неяк нябачна аб'ядноўваюцца ў адну, вялікую.

А калі я ўжо развіталася, да мяне падбегла дзяўчына з вялікім рулонам паперы пад рукой — рэдактар насценгазеты — папрасіла:

— Напішыце і для нас, калі ласка, заметку аб нашай групе. Так, як вы бачыце нас з боку.

Я абяцала.

**А. ЛЫСЮК,**
**студэнтка II курса журфака.**

● ТСН У ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ

# Эфектыўнасць прымянення

**За апошнія дзесяць год ва універсітэце шмат зроблена па набыццю тэхнічных сродкаў навучання, вылічальнай тэхнікі, стварэнню нестандартнага лабараторнага абсталявання, трэнажораў, абсталяванню аўдыторый, лабараторый і кабінетаў комплексам тэхнічных сродкаў навучання і ўкараненню іх у вучэбна-выхаваўчы працэс.**

**У 1971 годзе ў БДУ былі толькі тры кінафікаваныя залы, амаль не было сродкаў відэа- і гуказапісу, толькі ў дзвюх аўдыторыях на фізічным факультэце можна было выкарыстоўваць дыяпраектары, не было кінафікаванай аўдыторыі, лінгафонных кабінетаў, фільматэкі і ўласнага фільмафонду. Дыядапаможнікі ва універсітэце практычна не выпрабляліся.**

**Аб тым, як ідуць справы з выкарыстаннем ТСН цяпер, раскажуць Валянціна Міхайлаўна Дзянісенка, асістэнт кафедры вылічальнай матэматыкі, Таццяна Фёдараўна Каванава, дацэнт кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, Марат Уладзіміравіч Комар, дацэнт кафедры ядзернай фізікі, Святлана Міналаеўна Любіч, старшы выкладчык кафедры французскай, іспанскай і лацінскай моў, Рыгор Аляксандравіч Шумак, кандыдат юрыдычных навук, в. а. дацэнта кафедры крыміналістыкі Аляксей Іванавіч Іваненка, загадчык лабараторыі ТСН.**

**В. М. Дзенісенка:** — Зараз у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў усё шырэй і шырэй выкарыстоўваюць тэхнічныя сродкі навучання. Напрыклад, у нас з увядзеннем мікракалькулятара «Электроніка БЗ-21» зменена методыка правядзення практыкума па метадах вылічэнняў для студэнтаў трэціх—чацвёртых курсаў. З іх дапамогай быў расшыраны круг задач, якія рашаюцца, павысілася іх складанасць. Вельмі эфектыўнае выкарыстанне рэжыму праграміравання ў раздзелах практыкума па «Метадах вылічэнняў»: рашэнне лічбавых ураўненняў, інтэрпаліраванне, рашэнне прасцейшых дыферэнцыяльных ураўненняў і інш. Яно дазваляе выканаць частку адладачных работ пры падрыхтоўцы індывідуальных заданняў студэнтаў з выхадам на ЭВМ «ЕС-1020».

**Т. Ф. Каванава:** — На нашай кафедры выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе кінафільмы, фанаграмы вывучаемых тэкстаў па спецыяльнасці і вусных тэм, лабараторных работ па ўводна-карэктыўнаму курсу і тэкстаў па спецыяльнасці, слайды, дыяфільмы.

Фанаграма кожнай лабараторнай работы, напрыклад, разлічана ў сярэднім на 15—20 мінут гучання і змяшчае словы і выразы тэксту, што павінны засвойвацца адразу, разнастайныя практыкаванні да тэксту з элементамі праграміравання, якія дазваляюць засвойваць і замацоўваць лексічны і граматычны матэрыял, веданне якога неабходна для паспяховай работы над тэкстамі па спецыяльнасці. Гэтыя практыкаванні носяць як навучаючы, так і кантралюючы характар.

Студэнты, якія рэгулярна працуюць у лінгафонных кабінетах, набываюць навыкі правільнага і беглага чытання, добра ўспрымаюць мову на слых, распазнаюць граматычныя канструкцыі.

**М. У. Комар:** — Для нас сёння таксама адной з найбольш актуальных праблем педагогікі і методыкі навучання з'яўляецца праблема павышэння эфектыўнасці і ўдасканалення працэсу перадачы вучэбнай інфармацыі студэнтам на лекцыях.

Так, забеспячэнне неабходнай нагляднасці, якая садзейнічае лепшаму ўспрыманню вучэбнага матэрыялу пры вывучэнні курса «Асновы радыёэлектронікі», здзяйсняецца тэлевізійнай дэманстрацыйнай устаноўкай на базе відэамагнітафона, тэлевізара і універсальнага стэнда з наборам электронных модулей.

Дэманстрацыі робяць больш нагляднымі цяжка ўспрымаемыя раздзелы курса, прадстаўляюць студэнтам магчымасць пераканацца ў рэальнасці фізічных працэсаў, якія адбываюцца ў электронных ланцугах і вузлах, актывізуюць працэс засвойвання ведаў, размяркоўваюць больш раўнамерна інфармацыю, атрыманую ў час лекцыі.

Пры неабходнасці асобныя фрагменты лекцый могуць быць запісаны на відэамагнітафон з наступным паўтарэннем, што можа быць карысным для пачынаючага лектара пры падрыхтоўцы да лекцыі. Выкарыстанне дэманстрацый робіць больш эфектыўным працэс навучання і забяспечвае добры кантакт з аўдыторыяй.

**С. М. Любіч:**—Адным з найбольш даступных сродкаў навучання замежнай мове сярод іншых для нас з'яўляецца дыяфільм. Ён ствapae ўмовы для развіцця навыкаў вуснай мовы, садзейнічае больш глыбокаму засваенню вучэбнага матэрыялу. Мы лічым, што зараз асабліва важна выкарыстанне **агучаных** дыяфільмаў, бо яно дапамагае адначасова і зрокаваму і слыхавому ўспрыманню вучэбнага матэрыялу і забяспечвае больш трывалае фарміраванне практычных навыкаў.

**Р. А. Шумак:** — Авалоданне практычнымі навыкамі барацьбы з правапарушэннямі ў многім залежыць ад паспяховага засваення студэнтамі-юрыстамі палажэнняў навукі судовай бухгалтэрыі. Асаблівасцю гэтага курса з'яўляецца багацце схем, табліц, бланкаў дакументаў. Выкарыстоўваючы праекцыйныя апараты «Гарызонт», «Пратон», можна скараціць час на ілюстрацыю ўзаемасувязей паміж уліковымі рэгістрамі, рэквізітамі асобных дакументаў. Павышаюцца пры гэтым і магчымасці нагляднага ўспрымання складаных разлікаў, метадаў судова-бухгалтарскага разліку. З поспехам выкарыстоўваецца кадаскоп, які дазваляе дэманстраваць на экране схемы, запісы, выконваемыя выкладчыкам непасрэдна на занятках.

Немалыя цяжкасці для нас узнікаюць у арганізацыі кантролю за засваеннем студэнтамі асобных тэм і ўсяго курса ў цэлым. У рашэнні гэтай задачы неацэнную дапамогу аказвае выкарыстанне навучаючых і кантралюючых машын класа «КИСИ-5». Нават пры наяўнасці 10—15 камплектаў праграм (па 10 пытаннях з адказам у кожным камплекце) удаецца на працягу 10—15 мінут выявіць падрыхтаванасць усіх студэнтаў групы, устанавіўшы пры гэтым, па якіх пытаннях найбольш часта сустракаюцца цяжкасці. Накоплены кафедрай вопыт пераконвае ў высокай эфектыўнасці выкарыстання машын класа «КИСИ-5» у якасці ТСН.

**І ў заключэнне некалькі слоў аб тэхнічнай аснашчанасці вучэбнага працэсу ва універсітэце наогул сказаў Аляксей Іванавіч Іваненка, загадчык лабараторыі ТСН:**

— На сённяшні дзень ва універсітэце ёсць 33 аўдыторыі на 3090 месц, якія абсталяваны комплексам ТСН, звыш 200 аўдыторый, лабараторый, кабінетаў з тэхнічным навучаннем, 17 лінгафонных кабінетаў, два класы кантралюючых машын «КИСИ-5», аўтаматызаваны клас праграміраванага навучання «Эўрыка» на падрыхтоўчым факультэце для замежных навучэнцаў.

Вось ужо на працягу пяці гадоў паспяхова функцыяніруе аўтаматызаваны навучаючы клас на базе ЭВМ «Мінск-32», у якім толькі за мінулы навучальны год праведзена 1360 вучэбных заняткаў па мовах праграміравання, неарганічнай, аналітычнай, фізічнай хіміі, псіхалогіі, матэматычнай логіцы і іншых вучэбных дысцыплінах. Зараз уводзіцца ў вопытную эксплуатацыю першая чарга аўтаматызаванай тэлевізійнай навучаючай сістэмы АТНС-БДУ на базе ЭВМ серыі ЕС, будзе створана студэнцкая вылічальная зала на факультэце прыкладной матэматыкі. Дзейнічае выдатная тэлекінаўстаноўка ТАФ-745 для забеспячэння вучэбнага працэсу з прымяненнем тэлебачання ў паточных аўдыторыях фізічнага факультэта.

На многіх кафедрах палепшылася забеспячэнне лекцыйных курсаў дыдактычнымі матэрыяламі. Што і казаць, толькі за апошнія чатыры гады ў фоталабараторыі універсітэта выраблена па заяўках кафедр каля 30 тысяч дыяпазітываў у каляровым і чорна-белым адлюстраванні.

Настойліва і мэтанакіравана працуюць кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў па забеспячэнню кінадыядапаможнікамі, сродкамі гуказапісу, нагляднымі дапаможнікамі курса «Гісторыя КПСС». Ужо ўсе тэмы гэтага курса забяспечаны дыдактычным матэрыялам. У фільмафондзе універсітэта ў цяперашні час налічваецца звыш 1600 вучэбных кінафільмаў і кінафрагментаў, 785 дыяфільмаў, звыш 6000 дыяпазітываў.

Палепшылася выкарыстанне ў вучэбна-выхаваўчым працэсе вучэбных, навукова-папулярных, хранікальна-дакументальных фільмаў з фонду кінапракату. У сярэднім за кожны навучальны год у бягучай пяцігодцы праводзілася 1100—1200 паказаў кінафільмаў для студэнтаў і выкладчыкаў з ахопам звыш 150 тысяч чалавек у год.

Асабліва шырока выкарыстоўваецца кіно ў вучэбным працэсе кафедры біялагічнага, геаграфічнага, гістарычнага факультэтаў, кафедры гісторыі КПСС, агульнай фізікі, ваеннай, факультэта журналістыкі.

**Ва універсітэце працягваецца работа па ўкараненню тэхнічных сродкаў навучання, забеспячэнню лекцыйных курсаў дыдактычным матэрыялам. Пры гэтым галоўная ўвага ўдзяляецца комплекснаму выкарыстанню ТСН: кінафікацыі навучальнага працэсу, укараненню сродкаў відэа- і гуказапісу і тэлебачання, дыяпраекцыйных сродкаў, электронна-вылічальнай тэхнікі, стварэнню і выкарыстанню вучэбных наглядных дапаможнікаў.**

**Н. ЖУКАВА.**

● КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

# ПРЫКЛАД СЛУЖЭННЯ НАРОДУ

Напярэдадні 64-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту на гістарычным факультэце адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе С. А. Аслёзава «Калі не мы, то хто ж?», прысвечаная выдатнаму сыну беларускага народа, Герою Савецкага Саюза У. З. Царуку, якую арганізавалі дэканат гістфака, аддзел абслугоўвання бібліятэкі БДУ і савет ветэранаў універсітэта.

Удзельнікамі канферэнцыі былі баявыя паплечнікі Уладзіміра Зянонавіча Г. М. Шавела, былы камандзір партызанскага атрада, цяпер старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, М. У. Бусько, былы намеснік камісара партызанскага атрада, цяпер загадчык аддзела камітэта народнага кантролю БССР, аўтар кнігі выпускнік універсітэта С. А. Аслёзаў, А. У. Царук — сын праслаўленага героя.

З дакладамі аб рэвалюцыйнай і партыйнай дзейнасці У. З. Царука выступілі в. а. дацэнта кафедры гісторыі СССР В. А. Андруховіч, аспірант кафедры гісторыі КПСС І. Л. Велічанскі, студэнтка IV курса аддзялення гісторыі І. Кулакова. Пісьмо-заклік У. З. Царука «Слова дэпутата Вярхоўнага Савета БССР да сваіх выбаршчыкаў» зачытаў студэнт IV курса аддзялення гісторыі А. Ляўко.

Сын бедняка, які з малых гадоў даведаўся пра сялянскую працу, У. З. Царук трапіў у гушчыню рэвалюцыйнай барацьбы. Пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі маладога хлопца выбіраюць сакратаром рэўкома. Пад яго кіраўніцтвам праводзяцца першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў роднай вёсцы. З пачаткам грамадзянскай вайны У. З. Царук становіцца чырвонаармейцам, а затым палітруком роты 72-га стралковага палка. Пасля ўстанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі дыктатуры буржуазна - памешчыцкай Польшчы У. З. Царук пераходзіць на падпольную работу, уступае ў рады КПЗБ. Затым арышт і турма. Але 13-гадовае знаходжанне ў польскіх турмах не зламала мужнага камуніста. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. У. З. Царук становіцца актыўным удзельнікам сацыялістычных пераўтварэнняў. Вялікім аўтарытэтам карыстаўся Уладзімір Зянонавіч у сваіх землякоў. Доказам гэтага з'явілася выбранне яго дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Наперадзе быў непачаты край работы. Але мірнаму сацыялістычнаму будаўніцтву перашкодзіла вайна.

І зноў У. З. Царук на пярэднім краі барацьбы. Ён назначаецца сакратаром Стаўбцоўскага падпольнага райкома партыі і камандзірам партызанскага злучэння. Радзіма высока ацаніла баявыя заслугі У. З. Царука: у 1944 годзе яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны У. З. Царук прыняў актыўны ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі.

Такім прадстаў перад слухачамі жыццёвы шлях У. З. Царука. Мы ад усяго сэрца падзякавалі аўтару кнігі С. А. Аслёзаву за беражлівыя адносіны да дакументаў мінулага, за яго аповесць аб цудоўным, мужным чалавеку.

**А. ГУРКО,**
**В. КЕРНАЖЫЦКАЯ,**
**студэнты гістфака.**

● ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# У ПАСТАЯННЫМ ПОШУКУ

Вялікі ўклад у развіццё філасофскай адукацыі і навукі, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў унесла кафедра гісторыі філасофіі і логікі. Яна была адкрыта ў верасні 1947 года ў сувязі з адкрыццём філасофскага аддзялення на гістарычным факультэце. Першым яе загадчыкам стаў член-карэспандэнт АН СССР М. Т. Іаўчук. Пазней кафедра гісторыі філасофіі былаператворана ў кафедру гісторыі філасофіі і логікі (1953). Тады ж яе ўзначаліў першы доктар філасофскіх навук, беларус, член-карэспандэнт АН БССР, прафесар І. М. Лушчыцкі. Ён кіраваў ёю на працягу 20 гадоў, да апошніх дзён свайго жыцця.

Хоць кафедра гісторыі філасофіі і логікі арганізацыйна афармлялася толькі ў апошні час, лагічная і гісторыка-філасофская праблематыка ў Беларусі мае больш далёкія традыцыі. У даваенныя гады яна даследавалася і распрацоўвалася прафесарамі універсітэта С. Я. Вальфсонам, В. Н. Іваноўскім, Б. Э. Быхаўскім, В. І. Барычэўскім і іншымі, якія ўнеслі значны ўклад у справу барацьбы за перамогу марксісцкага светапогляду.

З часу стварэння кафедры гісторыі філасофіі і логікі пачаты і сістэматычна праводзяцца даследаванні па гісторыі філасофскай, грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі.

У работах І. М. Лушчыцкага «Грамадска-палітычная і філасофская думка ў Беларусі і Літве ў XIX стагоддзі», «Беларусь і Літва», «Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX стагоддзя» раскрываецца працэс вызваленчай барацьбы беларускага народа, творчасць і дзейнасць такіх выдатных прадстаўнікоў беларускага народа, як К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч.

У садружнасці з даследчыкамі гісторыі філасофіі АН БССР супрацоўнікі кафедры правялі вялікую работу па аналізу і ацэнцы філасофскіх ідэй, якія змешчаны ў творах Г. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, С. Лована, М. Сматрыцкага, К. Лышчынскага і многіх іншых мысліцеляў.

Навукова-даследчая работа кафедры не вычэрпваецца толькі адзначанымі напрамкамі. Вялікую цікавасць у чытачоў выклікалі манаграфіі М. І. Іоські «Мікалай Судзілоўскі-Русель» (1976), «К. Маркс, Ф. Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь» (1977), У. Ф. Бяркова «Пытанне як форма думкі» (1972), «Процілегласці ў навуцы» (1980), В. І. Бартона «Параўнанне як сродак пазнання» (1978).

Значная ўвага ўдзяляецца на кафедры праблемам навукова-метадычнай і вучэбна-метадычнай работы. За апошнія гады падрыхтаваны шэраг вучэбных дапаможнікаў па курсах, якія чытаюцца. Так, напрыклад, у 1974 годзе выдадзены вучэбны дапаможнік «Логіка» для студэнтаў гуманітарных факультэтаў, які атрымаў станоўчую ацэнку ў друку. У 1977 годзе выйшаў у свет «Зборнік практыкаванняў па логіцы» пад рэдакцыяй прафесара А. С. Кляўчэні (другое выданне — 1981).

Вялікую ўвагу ўдзяляе кафедра арганізацыі тэарэтычных канферэнцый. Так, у снежні 1976 г. сумесна з Інстытутам філасофіі і Інстытутам палітычных навук Ягелонскага універсітэта (ПНР) праведзены першы этап навуковай канферэнцыі «Праблемы ўзаемасувязі і ўзаемаўплыву філасофскай і грамадскай думкі славянскіх народаў».

Другі этап гэтай жа канферэнцыі праведзены ў Белдзяржуніверсітэце ў чэрвені 1977 года. У ліпені 1978 года кафедрай праведзена агульнаўніверсітэцкая навуковая канферэнцыя «Тэарэтычная спадчына М. Р. Чарнышэўскага». У 1980 годзе сумесна са Стаўбцоўскім, Мядзельскім, Маладзечанскім райкомамі партыі супрацоўнікамі кафедры праведзены навукова-тэарэтычныя канферэнцыі, прысвечаныя 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Выключна вялікая роля кафедры гісторыі філасофіі і логікі ў справе падрыхтоўкі навуковых кадраў праз аспірантуру. Яе вучні цяпер працуюць амаль ва ўсіх ВНУ рэспублікі і за яе межамі. За апошнія гады кафедрай падрыхтавана 62 кандыдаты навук, два дактары. Усяго ж па праблематыцы кафедры з яе дапамогай і па яе рэкамендацыі абаронена 80 кандыдацкіх, 13 доктарскіх дысертацый.

Значныя поспехі дасягнуты кафедрай і ў выкладчыцкай дзейнасці. Расшырана кола дысцыплін, якія чытаюцца, лекцыі сталі больш разнастайнымі па зместу, насычанасці фактычным і тэарэтычным матэрыялам. Выкладчыкі кафедры чытаюць спецкурсы па крытыцы сучаснай буржуазнай філасофіі, гісторыі дыялектыкі, гісторыі філасофскай і грамадскай думкі Беларусі, па логіцы і метадалогіі навукі, дыялектычнай логіцы.

Цяпер кафедра гісторыі філасофіі і логікі пад кіраўніцтвам прафесара А. С. Кляўчэні ўдасканальвае вучэбна-выхаваўчую, навукова-метадычную і навукова-даследчую работу ў святле патрабаванняў гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, іншых рашэнняў партыі і ўрада. Супрацоўнікі кафедры поўныя рашучасці ўнесці дастойны ўкладу справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў.

**А. ЛЕБЕДЗЕЎ,**
**партгрупорг,**
**А. ЛЯГЧЫЛІН,**
**прафгрупорг.**



**Вікторыя Каўхута — адна з актыўных студэнтак філалагічнага факультэта. Яна атрымлівае стыпендыю імя Пятруся Броўкі.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

# *ЗОРНЫМІ МАРШРУТАМІ*

Чарговы старт традыцыйных зімовых паходаў адбыўся ў пачатку канікулаў ля памятнага Знака студэнтам і супрацоўнікам БДУ, якія загінулі ў баях за Радзіму ў час Вялікай Айчыннай вайны. Ад імя савета ветэранаў з бацькоўскім словам-наказам перад прадстаўнікамі груп выступіў супрацоўнік мехмата А. С. Мізрахі. Ён выказаў словы ўдзячнасці маладому пакаленню за тое, што яно не забывае гераічнага мінулага сваёй Радзімы, заклікаў працягваць вельмі важную работу па пошуку герояў вайны, якія яшчэ не выяўлены.

Дзесяткі юнакоў і дзяўчат прайшлі па месцах баявых дзеянняў брыгады імя К. Варашылава, парушылі спакой Налібоцкай пушчы, наведалі Ушаччыну, дзе прарвалі вогненнае кола акружэння легендарныя партызанскія атрады і брыгады. Студэнцкая лыжня пралягла праз паўночныя раёны Віцебскай вобласці і захад Гродзенскай.

Шмат цікавых сустрэч з ветэранамі вайны і працы, перадавікамі вытворчасці чакалі ўдзельнікаў паходу. З асаблівай старannасцю рыхтаваліся яны і да гутарак з выпускнікамі мясцовых сярэдніх школ — прафарыентацыя таксама стаяла на парадку дня ўдзельнікаў паходаў, а пра родны БДУ і яго традыцыі студэнты імкнуліся расказаць найбольш поўна і цікава.

**У. СЯМІРСКІ,**
**старшыня турклуба БДУ.**

● ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

# ІМКНЕННЕ ДА ЎДАСКАНАЛЕННЯ

Кім бы мы ні сталі пасля заканчэння універсітэта—фізікамі, хімікамі, юрыстамі, нам прыйдзецца займацца грамадскай работай. Усведамляючы гэта, мы імкнёмся паралельна з асваеннем асноўнай прафесіі ўдасканальваць свой вопыт у адносінах з людзьмі, набываць неабходныя арганізатарскія веды, расшыраць свой кругагляд.

Спецыяльных дапаможнікаў, падручнікаў для арганізатараў грамадскай работы няма. Але ў нас у БДУ існуе выдатная магчымасць удасканалення—факультэт грамадскіх прафесій.

Доўгі час пры камітэце камсамола дзейнічала школа камсамольскага актыву. Потым узнікла думка стварыць школу арганізатараў грамадска-палітычнай работы на базе факультэта грамадскіх прафесій. У гэтым годзе школа зрабіла ўжо свой трэці набор. Яе слухачы маюць магчымасць падрыхтаваць сябе да наступных аспектаў грамадскай работы: арганізацыі ўнутрысаюзнай работы ВЛКСМ, грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў і навучэнцаў, Ленінскага заліку, прафсаюзнай работы, адпачынку моладзі, грамадскай дапамогі сацыёлагам.

Аб папулярнасці самага буйнога аддзялення ФГП ужо гаворыць той факт, што жадаючых паступіць на яго ў гэтым годзе было намнога больш, чым школа можа прыняць. Гэта тлумачыцца тым, што заняткі заўсёды цікавыя, лекцыі чытаюць вопытныя спецыялісты. Залік ў канцы другога года навучання праводзіцца ў форме субяседавання, якое выяўляе, што ўзяў для сябе слухач школы, чаму навучыўся.

— Што прывяло вас у школу арганізатараў грамадска-палітычнай работы?— з гэтым пытаннем звяртаюся да дзяўчат-першакурсніц.

Наталля Яныш: — Я займаюся на аддзяленні грамадскай дапамогі сацыёлагам. А сацыялагічныя даследаванні — вельмі важная і цікавая справа. Да таго ж вельмі каштоўна, што пры школе арганізаваны карысныя факультатывы, на адным з якіх я магу авалодаць стэнаграфіяй.

Алена Грышкевіч: — Мне заўсёды хацелася навучыцца майстэрству гаварыць і валодаць увагай аўдыторыі. Таму выбрала аддзяленне лекцыйна-прапагандысцкай работы.

А што дала школа арганізатараў ГПР тым, хто навучаецца другі год? Аб гэтым расказаў студэнт другога курса юрфака Аляксандр Дацэнка. Саша адзначыў, што пасля наведвання заняткаў школы яму значна лягчэй і цікавей выконваць свае грамадскія абавязкі.

Побач з ім сядзеў Ігар Мікула, першакурснік, які прыйшоў сюды па рэкамендацыі А. Дацэнкі. Ігар — член камсамольскага бюро групы. Ён упэўнены, што навучыцца ў школе не толькі «азам» грамадскай работы, але і многаму таму, што неабходна ведаць людзям яго прафесіі.

Думаецца, далучыцца да яго слоў зможа кожны слухач школы.

**С. ЯСКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

# Са свету па нітцы

## ДАТЫЧЫЦЬ КОЖНАГА

ЗАКОНЧЫЎСЯ першы семестр навучальнага года. Мне хочацца падзяліцца тымі ўражаннямі, якія аказалі на мяне студэнты—сябры і паплечнікі, што сабраліся на завочным факультэце аддзялення журналістыкі і філалагічнага аддзялення з усіх куткоў Беларусі ад Брэста і Гродна на захадзе, ад блакітных азёраў Браслаўшчыны і Верхнядзвіншчыны на поўначы да неабсяжных палескіх нізін на поўдні, якія вызначылі ўжо сваё прызванне — будучыя журналісты, літаратары, мовазнаўцы, настаўнікі.

Мяне цікавіла пытанне, якую ролю іграе фальклор у іх грамадскім жыцці, як авалодваюць культурнай спадчынай, як карыстаюцца ёю і што робяць, каб узбагаціць скарбонку.

Далёка не ўсе займаюцца ўзбагачэннем сваёй памяці веданнем усіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва, а фальклор быў асноўнай формай мастацкага адлюстравання рэчаіснасці на працягу многіх стагоддзяў.

Нельга не цікавіцца гэтым відам народнай творчасці. Вядома, што пад уплывам літаратурнай жывая мова змяняецца — такі закон яе развіцця. Калі не занатаваць яе сёння, яна можа бясследна знікнуць заўтра. На жаль, гэтай справай займаюцца толькі адзінкі. Мне здаецца, што гэта справа не толькі лінгвістаў—існуе такая думка, — а ўсіх спецыялістаў, якія маюць справу са словам.

Адсутнасць такой работы сказваецца ў працах многіх спецыялістаў, і асабліва ў матэрыялах раённых газет, дзе ў большасці працуюць карэспандэнтамі студэнты аддзялення журналістыкі. А якое ў іх поле дзейнасці! Якія магчымасці! Трэба толькі своечасова звярнуць увагу на чалавека, на яго мову, зацікавіцца яго лёсам. Адна справа, калі ў вёску прыязджае навуковая экспедыцыя па збору фальклорнага матэрыялу, але зусім другое, калі ты жывеш у гэтай мясцовасці, ведаеш звычкі людзей, якія табе давяраюць.

Стала ісцінай тое, што кожны чалавек павінен пасадзіць дрэва, і, на мой погляд, павінен яшчэ кожны чалавек прыняць удзел у збіранні народнага багацця. Уявіце сабе, які тады пасаг застанецца нашчадкам. І больш за ўсё гэта датычыць студэнтаў — будучых журналістаў і філолагаў.

Мне здаецца, пачынаць трэба з абітурыентаў, якім не лішне было б разам з дакументамі прывезці не толькі публікацыі, але і апісанне месца жыхарства, якія людзі там жывуць, якія дыялекты там існуюць, звязаныя з прафесіяй і працай. Вось гэта і была б самая аб'ектыўная характарыстыка.

І сярод тых, хто праводзіць работу па збору народнага набытку, ёсць такія, што робяць гэта не зусім правільна, працуюць кустарна, не ўмеюць апрацаваць матэрыял.

Амаль не маюць ніякага значэння частушкі або песні, запісаныя на паперу. Тут лепш за ўсё карыстацца магнітафонам. Магнітафонны запіс дае дакладны, рэальны малюнак фанетычных, лексіка-фразеалагічных, граматычных і рытма-меладычных асаблівасцей і рыс мовы.

Не менш цікава збіраць дыялектызмы, прымаўкі, выслоўі, прыказкі. Робячы такую справу, трэба абавязкова падтрымліваць сувязь з іншымі збіральнікамі, сачыць за рознымі даведнікамі і мець на ўзбраенні кнігі, якія падрыхтаваў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору пры АН БССР, а іх будзе каля трыццаці: «Прымаўкі і прыказкі», дзе матэрыялы ўзяты як са старых выданняў і архіваў, так і з новых запісаў; «Выслоўі» — кніга, у якой упершыню найбольш поўна пададзены розныя трапныя і дасціпныя выразы, скарагаворкі, застольныя жарты і тосты, вітанні, прысяганні, праклёны, абзыванні, ганьбаванні, параўнанні. Пры размове са студэнтамі мне здалося, што не ўсе нават звярнулі ўвагу на гэтую кнігу, а запісваць праклёны, абзыванні, ганьбаванні нават у галаву не прыходзіла. Не знайшла я ніводнага чалавека, які б збіраў загадкі. А загадка належыць да тых жанраў беларускага фальклору, у якім найбольш ярка праявілася мудрасць народа, яго тонкая жыццёвая назіральнасць, любоў да паэзіі, трапнага слова.

Ёсць такі вельмі цікавы від народнай творчасці, як замовы, якія ў сучасны момант у жывым бытаванні амаль не сустракаюцца. Іх можна пачуць толькі ад рэдкіх «прафесіяналаў», калі ўвайсці да іх у вялікі давер. Як казаў адзін студэнт, лепш за ўсё самому «захварэць» і пайсці лячыцца да такога шаптуна. Аловак тут можа сапсаваць усю справу.

Часта чуецца такое: «Я жыву ў горадзе. Які тут фальклор?» Цікавы матэрыял можна сабраць і ў горадзе. Адзін са студэнтаў другога курса аддзялення журналістыкі, жывучы ў вёсцы, запісаў сваю першую казку ў Полацку. Трэба мець на ўвазе, што ў мікрараёнах Мінска можна пачуць усе тыя дыялекты, якія існуюць у Беларусі, ды і старыя бацькі часцей за ўсё пераязджаюць у горад да сваіх дзяцей.

Не трэба спадзявацца, што варта толькі пачаць збіраць фальклорны матэрыял або ўспаміны аб войнах, аб жыцці, як яны і «пасыплюцца ў мяшок». Гэта вельмі складаная і працаёмкая справа. Але заўсёды трэба памятаць, што можна атрымаць добрую кансультацыю ва універсітэце ў выкладчыка беларускай літаратуры, які мае вялікі вопыт па збору фальклору, Каладзінскага Вячаслава Васільевіча і ў выкладчыка сучаснай беларускай мовы Каваленкі Мікалая Рыгоравіча.

Галоўнае, на мой погляд, гэта быць аператыўным у гэтай справе. Калі сабраў той ці іншы матэрыял, то не трэба трымаць яго ў сябе, бо гэта народны набытак.

**М. ДЗЯЛУН,**
**студэнтка II курса журфака.**



*Снег ляжыць чаромхай белай,*
*Свежасць, бы ў маёвым садзе.*
*Цішыні баюся здрадзіць,*
*Як дзіця,*
*іду нясмела.*

*З берагамі поўніць вочы*
*Далеч,*
*родная да болю...*
*І душа мая, як поле,*
*Быць такою ж чыстай хоча.*

# АДПАЧЫЦЬ ДАПАМОГ ПРАФСАЮЗ

Студэнцкія канікулы — час актыўнага адпачынку, змены ўражанняў, новых сустрэч, падарожжаў. Ва ўсе канцы нашай краіны вязуць цікаўных, непаседлівых рамантыкаў хуткія цягнікі, самалёты, турыстычныя аўтобусы. Многія студэнты падарожнічаюць і адпачываюць па пуцёўках прафсаюза.

У нашым універсітэце размеркаваннем пуцёвак у лячэбныя прафілакторыі, дамы адпачынку, на турбазы займаецца спартыўна-аздараўленчая камісія прафкома БДУ.

— Канешне, жадаючых шмат, — гаворыць намеснік старшыні прафкома па арганізацыйна-масавай рабоце Н. Туромша,—бо такая форма адпачынку стала распаўсюджанай. Тым больш, што прафсаюз прадастаўляе студэнтам адчувальныя льготы.

Турбазы «Сухумі», «Чырвоная паляна — Кудэпста» ў раёне Сочы, санаторый «Зеленаградск» на Балтыйскім узмор'і, Каўказ, Прыдняпроўе, Іркуцк — такая геаграфія адпачынку студэнтаў універсітэта.

У пансіянатах і дамах адпачынку, размешчаных ля маляўнічых вадаёмаў нашай рэспублікі,—«Лясныя азёры», «Нарач», «Буг» і ў міжвузаўскім санаторыі «Юнацтва» цікава правялі вольны час зімовых канікулаў 185 студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Яшчэ 48 чалавек былі ў захапляючай тыднёвай паездцы на турыстычным поездзе па маршруту Мінск — Харкаў — Кіеў — Севастопаль — Мінск. Яны наведалі месцы баявой славы савецкага народа, гістарычныя помнікі, пазнаёміліся з сучасным абліччам гэтых гарадоў.

Ужо даўно склалася такая традыцыя: група, якая заняла першае месца па выніках вучобы пасля зімовай сесіі ўзнагароджваецца турыстычнай пуцёўкай у адзін з гарадоў нашай краіны. У гэтым годзе права на паездку ў Ленінград заваявала група IV курса гістарычнага факультэта (аддзяленне паліт-эканоміі).

Усяго па санаторных і турыстычных пуцёўках прафсаюза універсітэта за час зімовых канікулаў адпачылі 350 чалавек, у тым ліку 178 замежных студэнтаў. Многія з іх пабывалі ў Ленінградзе, Баку, Валгаградзе, Маскве, Адэсе.

Аднак, часам здараецца, што ў прафкоме застаюцца такія пуцёўкі, якія ўжо немагчыма выкарыстаць. Адбываецца гэта таму, што студэнты нясвоечасова падаюць заявы. Падача заяў загадзя дазволіла б камісіі прафкома палепшыць размеркаванне і выдачу пуцёвак.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

## РЭХА КАНІКУЛАЎ

# ІМГНЕННІ СУСТРЭЧ

Шмат новых сустрэч, уражанняў падарылі нам зімовыя канікулы. Падарылі яны і захапляючую экскурсійную паездку па гарадах краіны: Кіеву, Харкаву, Севастопалю. Шмат цікавага ўбачылі і пачулі студэнты ў час экскурсіі. Наведалі вядомую Кіева-Пячэрскую лаўру, цудоўныя саборы. Майстэрства старажытных дойлідаў назаўсёды застанецца ва ўспамінах. Вялікую цікавасць выклікала і экскурсія па гораду-герою Кіеву. Крашчацік не мог не пакарыць сваёй урачыстай веліччу. Шмат цікавага даведаліся мы пра культурнае і працоўнае жыццё горада.

Змястоўнай была экскурсія і па Харкаву: мастацкі музей, самая вялікая плошча ў Еўропе — плошча Дзяржынскага, мемарыяльны комплекс у гонар загінуўшых за Радзіму савецкіх воінаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Апошнім на маршруце быў Севастопаль. Ужо 31 студзеня тут адчувалася набліжэнне вясны: ярка і ветліва свяціла сонца, пелі птушкі. Для ўдзельнікаў турпоезда была падрыхтавана цёплая сустрэча, іграў аркестр Чарнаморскага флоту. Была арганізавана цікавая экскурсія на Сапун-гару, Малахаў курган. Мы наведалі дыяраму ўзяцця Сапун-гары ў 1944 годзе, панараму абароны Севастопаля ў час руска-турэцкай вайны, а пасля гэтага — гісторыка-археалагічны запаведнік Херсанес.

**А. ЗАЙЦАВА,**
**студэнтка мехмата.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
25 лютага 1982 г.
АТ 21147 Заказ 385.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ